# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПАДЗЕЙ 1917 Г. НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Мікалаева Л.В. г. Мінск, БДУІР

Вывучаючы гісторыю рэвалюцыйных падзей 1917 г. на тэрыторыі Беларусі, даследчыкі павінны пастаянна мецць на ўвазе тую акалічнасць, што рэвалюцыйныя дзеянні – спецыфічны аб’ект гістарычнага даследавання. У мінулым сацыяльныя і палітычныя рэвалюцыі стымулявалі рух гісторыі, прыводзячы да нараджэння новых грамадска-палітычных рэалій. На практыцы яны станавіліся выйсцем з разнастайных крызісных сітуацый. Як правіла, яны былі звязаны з барацьбой за захоп і ўтрыманне ўлады. Так як у азначанай барацьбе заўсёды былі пераможаныя і пераможцы, мы не можам сцвярджаць поўную незалежнасць поглядаў даследчыкаў рэвалюцыйных падзей ад іх прыналежнасці да пэўнага палітычнага лагера. Рэвалюцыйныя падзеі пад пяром прадстаўнікоў пераможцаў набывалі апалагетычныя рысы, а ў падачы іх антаганістаў, наадварот, асуджаліся і зведвалі абвінавачванні. Разам з тым, зразумела, што рэвалюцыйная дзейнасць з’яўляецца гістарычнай. Яна ажыццяўляецца ў часе і прасторы. Таму даследчыкі могуць яе вывучаць з дапамогай агульнанавуковых і спецыяльных метадаў пазнання.

Гісторыкі-прафесіяналы ўсведамляюць значэнне метадалогіі для ажыццяўлення даследавання. Метадалогія гісторыі з’яўляецца своеасаблівым механізмам навуковага пазнання [13, с. 11]. Выбраная метадалогія можа ўплываць на канчатковы вынік у выглядзе пэўнай тэарэтычнай канцэпцыі ці палажэнняў. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання аказваюць уздзеянне і на выкарыстанне

даследчыкамі пэўнага паняційна-катэгарыяльнага апарату. У дачыненні да рэвалюцыйных падзей 1917 г. замацаваўся агульны тэрмін (Вялікая) Руская рэвалюцыя або (Вялікая) Расійская рэвалюцыя. У яе рамках прынята выдзяляць падзеі лютата і кастрычніка 1917 г. Можна адзначыць шырокую разнастайнасць вызначэнняў, якія прымяняюцца ў дачыненні да рэвалюцыйных падзей кастрычніка 1917 г. Адны гісторыкі па-ранейшаму сцвярджаюць, што гэта была Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, якая паклала пачатак навейшага перыяду ў гісторыі ўсяго чалавецтва. Другія прытрымліваюцца меркавання, што гэта быў пераварот [6], бальшавіцкі загавар, проста ўзброенае паўстанне [11, с. 202] і г.д. На старонках апошніх беларускіх энцыклапедычных выданняў адлюстраваны пагляд на кастрычніцкія падзеі 1917 г. як на сацыяльную рэвалюцыю, у ходзе якой да ўлады прыйшла партыя бальшавікоў, што ўзяла курс на ліквідацыю капіталістычных адносін і пабудову сацыялізму [12, с. 552]. Пераважная большасць сучасных гісторыкаў ужывае для пазначэння сітуацыі восені 1917 г. назву “Кастрычніцкая рэвалюцыя”.

Трэба адзначыць, што доўгі час 1917 год асацыіраваўся пераважна з Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Хаця, як вядома, рэвалюцыйны выбух пачаўся з падзення самадзяржаўя ў лютым-сакавіку 1917 г. і меў лагічнае завяршэнне ў выглядзе перамогі ўзброенага паўстання ў Петраградзе ў кастрычніку 1917 г. Такім чынам, рэвалюцыйныя падзеі не былі аднамомантнай з’явай. Яны мелі пэўную працягласць у часе і былі насычаны мноставам рознапланавых, рознамаштабных, рознанакіраваных дзеянняў.

Першапачаткова на рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. склаўся погляд як на цэласную гістарычную з’яву. Аднак у 1930-х гг. савецкім гісторыкам былі навязаны афіцыйныя метадалагічныя ўстаноўкі, у адпаведнасці з якімі ў аснову гістарычных даследаванняў павінна была быць пакладзена “идея противоположности между революцией буржуазной и социалистической”. Гісторыкі павінны былі падкрэсліваць, што “буржуазная революция, освободив народ от цепей феодализма и абсолютизма, наложила на него новые цепи, цепи капитализма и буржуазной демократии, тогда как социалистическая, революция в России разбила все и всякие цепи и освободила народ от всех форм эксплуатации” [14, с. 43]. Партыйным кіраўніцтвам

была прадыктавана і схема перыядызацыі гісторыі ВКП(б), у адпаведнасці з якой падзеі лютага-сакавіка 1917 г. адносіліся да аднаго перыяду з імперыялістычнай вайной (“VI. Партия большевиков в период империалистической войны и второй русской, февральской революции. (1914 – февраль-март 1917 года)”). Наступны перыяд у гісторыі партыі пачынаўся з красавіка 1917 г. (“VII. Партия большевиков в период подготовки и проведения Октябрьской социалистической революции. (апрель 1917 – 1918 год)”) [15, с. 211]. Гэта схема пачала выкарыстоўвацца і ў дачыненні да падзей гісторыі Расійскай дзяржавы, СССР і рэспублік, якія ўваходзілі ў яго склад, у т.л. Беларусі.

Наступствам такога падыходу стала апісанне падзей 1917 г. у катэгорыях дзвюх рэвалюцый, якія кардынальна адрозніваліся паміж сабой: Лютаўскай – “буржуазна-дэмакратычнай” і Кастрычніцкай – “сацыялістычнай”. Пры гэтым сацыялістычная рэвалюцыя разглядалася савецкімі вучонымі як “гістарычна апошні тып палітычных рэвалюцый” [16, с. 235]. Неабходна адзначыць, што працяглы перыяд тэарэтыкі марксізму лічылі, што перамога сацыялістычнай рэвалюцыі магчымая толькі ў выніку гвалтоўнага пераварота (узброенага паўстання) ці грамадзянскай вайны. Толькі ў канцы 1950-х гг. яны прыйшлі да высновы пра магчымасць мірнай заваёвы ўлады працоўнымі, у т.л. і парламенцкім шляхам [10, с. 339].

Ацэнка лютаўскіх і кастрычніцкіх рэвалюцыйных падзей 1917 г. як антаганістычных з’яў знайшла адлюстраванне і ў адпаведнай перыядызацыі. У выніку атрымлівалася раз’яднанне дзвюх этапных вехаў у развіцці агульнага рэвалюцыйнага працэсу па розных раздзелах і нават тамах. Прыкладам могуць служыць усе абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі, якія пабачылі свет пасля Другой сусветнай вайны [2; 4; 5]. Такі падыход можна ўбачыць і ў “Нарысах гісторыі Беларусі”, дзе інфармацыя аб Лютаўскай рэвалюцыі змешчана ў першай частцы выдання, а матэрыялы аб наступных падзеях – у другой [8]. Такі ж падыход прымяняецца ў большасці з сучасных навучальных дапаможнікаў і падручнікаў па гісторыі Беларусі, а таксама ў 6-томнай “Гісторыі Беларусі”, аўтары якой таксама раскідалі інфармацыю пра падзеі лютага і кастрычніка 1917 г. па розных тамах [1]. Аднак у апошняй ужо заўважны адыход

ад разгляду Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у адрыве ад агульнага рэвалюцыйнага працэсу.

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г., бесспрэчна, можна разглядаць як прыклад рэальнага існавання дзвюх альтэрнатыўных ліній развіцця – буржуазна-дэмакратычнай і сацыялістычнай. Аднак пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў рэчаіснасці абедзве гэтыя лініі ў той ці іншай ступені прысутнічалі на ўсіх этапах рэвалюцыі, суіснавалі, перапляталіся, канкурыравалі паміж сабой, складаючы тым самым змест самога рэвалюцыйнага перыяду з лютага да канца 1917 г. Справядлівасць такіх меркаванняў у пэўнай ступені пацвярджаецца складанасцю і нават немагчымасцю правядзення дакладнай храналагічнай мяжы паміж канцом Лютаўскай і пачаткам Кастрычніцкай рэвалюцыі. Азначаныя акалічнасці прыводзяць да выразных накладак, калі нават у адных і тых жа выданнях падзеі ад лютага да кастрычніка 1917 г. разглядаюцца аднгачасова пад вызначэннем і буржуазна-дэмакратычнай, і сацыялістычнай рэвалюцый [3; 6].

Звяртаючыся да праблем вывучэння падзей Расійскай рэвалюцыі 1917 г., даследчыкі прапаноўваюць зыходзіць з факта шматзначнасці самога тэрміна “рэвалюцыя”. Так, у адпаведнасці са звесткамі тлумачальнага слоўніка С.І. Ажэгава, рэвалюцыя – гэта “1. Коренной переворот в обществе, который приводит к ликвидации общественного и политического строя и передает власть в руки передового класса. 2. Коренной переворот, резкий скачкообразный переход от одного качественного состояния к другому” [9, с. 585]. Расійскі даследчык В.І. Мілер таксама звярнуў ўвагу на тое, што тэрмін “рэвалюцыя” можа абазначаць некалькі блізкіх, але нераўназначных з’яў: падзею, перыяд і працэс. Аднамомантны акт звяржэння старога рэжыму і прыходу да ўлады новых палітычных сіл (рэвалюцыя як падзея) становіцца зыходным пунктам перыяду рэвалюцыі. На думку В.І. Мілера, гэта надзвычайны этап у гісторыі краіны, які характарызуецца наяўнасцю такіх рысаў, як “политическая (иногда и экономическая) нестабильность, полностью естественная в этих условиях поляризация сил и, как результат, непредсказуемость последующего развития событий” [7, с. 50]. У шэрагу прац беларускіх даследчыкаў можна адзначыць імкненне да разгляду феномена рэвалюцыі як працэсу [1; 11; 12].

Супрацьпастаўленне розных метадалагічных падыходаў да даследавання і вывучэння гісторыі рэвалюцыйных падзей 1917 г. прывяло да з'яўлення некалькіх канцэпцый і версій адлюстравання рэвалюцыйных падзей 1917 г. у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Значная ўвага пры гэтым надавалася менавіта падзеям кастрычніка 1917 г.

У савецкай гістарыяграфіі найбольш аргументавана была распрацавана марксісцкая канцэпцыя падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі. У адпаведнасці з ёю, Кастрычніцкая рэвалюцыя з'яўлялася аб'ектыўнай заканамернасцю развіцця расійскага грамадства. Яна была другім, сацыялістычным этапам Расійскай рэвалюцыі і вырашыла пытанне аб уладзе на карысць рабочага класа і найбяднейшага сялянства на чале з партыяй бальшавікаў. Рухаючымі сіламі Кастрычніцкай рэвалюцыі з'яўляліся рабочы клас і найбяднейшае сялянства, пралетарскія і паўпралетарскія пласты горада і вёскі. Рашаючай умовай перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі з'яўлялася кіруючая дзейнасць партыі бальшавікоў. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі стварыла спрыяльныя перадумовы для завяршэння ў краіне дэмакратычных пераўтварэнняў і адначасовага ажыццяўлення сацыялістычных пераўтварэнняў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

На хвалі бязмежнага "разгула" дэмакратыі на мяжы XX – XXI стст. шырокую вядомасць набыла створаная яшчэ ў асяроддзі расійскіх эмігрантаў у першай палове XX ст., а ў наш час некалькі падфарбаваная новымі фарбамі ліберальная канцэпцыя падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі, якую спрабуюць прапагандаваць нават некаторыя былыя гісторыкі-марксісты. Сутнасць ліберальнай канцэпцыі падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі зводзіцца да наступнага: Кастрычніцкая рэвалюцыя – выпадковая з'ява ў расійскай гісторыі. Гэта – вярхушачная змова расійскіх бальшавікоў на чале з У.І. Леніным, не падтрыманых расійскім народам, якая прывяла да кровапралітнай Грамадзянскай вайны.

У асяроддзі нацыянальна арыентаваных расійскіх інтэлектуалаў склалася канцэпцыя Кастрычніцкай рэвалюцыі як сіяністка-масонскай змовы супраць Расіі. Яе стваральнікі разглядаюць рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. як агульны справакаваны і звонку аплачаны працэс, які меў два этапы: лютаўскі (ліберальны, ці масонскі) і

кастрычніцкі (бальшавіцкі ці яўрэйскі, бо бальшавікі таго часу, на думку прыхільнікаў гэтай канцэпцыі, – гэта ці яўрэі, ці паслухмяныя выканаўцы іх волі). Расія пала ад удараў у спіну ў выніку загавора шматлікіх антырускіх сіл як звонку (масоны, сіяністы), так і знутры ("пятая калона", што складалася з часткі ліберальнага дваранства і інтэлігенцыі, пазбаўленых нацыянальнай свядомасці, якія аддавалі перавагу асновам жыцця, формам і ўяўленням, запазычаным у Заходняй Еўропе і ЗША, замест рускіх народных асноў жыцця).

На сённяшні дзень ліберальная канцэпцыя і канцэпцыя "масонскай змовы" не знаходзяць належнага пацвярджэння крыніц. Марксісцкая канцэпцыя таксама патрабуе пэўнай карэктыроўкі, хаця б з пункта гледжання на ролю пралетарыяту ў рэвалюцыйных падзеях на тэрыторыі Беларусі, якая перабольшана. Разам з тым, нельга адмаўляць таго яе пастулата, што Кастрычніцкая рэвалюцыя, як ў Расіі, так і ў Беларусі, мела заканамерны характар. Яна азнаменавала сабой спробу працоўнага народа вырвацца з палону тых супярэчнасцей, якія былі абумоўлены ўзроўнем рыначных адносін таго часу, абазначыла імкненне пабудаваць грамадства на прынцыпах сацыяльнай справядлівасці.

Такім чынам, у новых умовах гістарычныя ўрокі рэвалюцыйных падзей 1917 г. патрабуюць глыбокага асэнсавання. І не толькі з пункта гледжання "прымірэння бакоў", але і ў сілу неабходнасці разумення праблем сучаснага соцыўма, новых супярэчнасцей, ступені і неабходнасці рэалізацыі рэформ, накіраваных на задавальненне інтарэсаў усяго грамадства.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: У 6 т. – Мінск: «Экаперспектыва», 2007 – 2011. – Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – 2007. – 519 с.; іл.; Т. 5. Беларусь у 1917 – 1945 гг. – 2007. – 613 с.; іл.

2. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т./ АН БССР; пад рэд. І.М. Ігнаценка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – Т. 2: Беларусь у перыяд капіталізму (1861 – 1917 гг.). – 684 с.; Т. 3: Перамога вялікай кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917 – 1937 гг.). – 694 с.

3. Ігнаценка, І. Лютаўская рэвалюцыя 1917/ І. Ігнаценка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск: БелЭН, 1997. –Т. 4. Кадэты – Ляшчэня. – 432 с.: іл. – С. 418 – 420.

4. История Белорусской ССР: В 2 т./ Акад. наук БССР. Ин-т истории ; Под общ. ред. Л.С. Абецедарского [и др.]. – 2-е изд., доп. – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1961. – Т. 1/ Ред. коллегия: Л.С. Абецедарский [и др.]. – 655 с., 17 л. ил., карт.: ил.; Т. 2/ Ред. коллегия: Т.С. Горбунов, Н.В. Каменская, И.С. Кравченко. – 700 с.

5. История Белорусской ССР/ Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск: Наука и техника, 1977. – 629, [1] с., [6] л. карт, ил.: ил.

6. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск: БелЭН, 1997. –Т. 4. Кадэты – Ляшчэня. – 432 с.: іл. – С. 139 – 141.

7. Миллер В.И. Осторожно: история!: [Сборник]/ В.И. Миллер. – М.: ЭТЦ, 1997. – 222 с.

8. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Мінск: Беларусь, 1994 – 1995. – Ч. 1/ М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў [і інш.]. – 1994. – 527 с.; іл.; Ч. 2/ М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі [і інш.]. – 1995. – 560 с.; іл.

9. Ожегов, С.И. Словарь русского языка: Ок. 57 000 слов/ С.И. Ожегов. – 18-е изд., стереотип. – М.: Рус. яз., 1987. – 797 с.

10. Революция // Политология: Энциклопедический словарь/ Общ. ред. и сост: Ю.И. Аверьянов. – М.: Изд-во Моск. коммерч. ун-та, 1993. – 431 с. (в пер.) – С. 338 – 340.

11. Рудовіч, С.С. Беларусь у перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г./ С.С. Рудовіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Мінск: БелЭн, 2004. – Т. 18. Кн. 2: Рэспубліка Беларусь. – 760 с.: іл. – С. 199 – 204.

12. Рудович, С.С. Октябрьская революция 1917/ С.С. Рудович/ Республика Беларусь.: Энциклопедия: В 6 т. Минск: БелЭн, 2007. – Т. 5. – 752с.: илл. – С. 552 – 554.

13. Сидорцов, В.Н. Методология истории: Курс лекций/ В.Н. Сидорцов. – Минск, БГУ, 2010. – 207 с.

14. Сталин, И. Замечания о конспекте новой истории/ И. Сталин, С. Киров, А. Жданов // Сталин, И.В. Сочинения: в 18 т./ И.В. Сталин. – М.: Изд-во «Писатель», 1997. – 360 с. – С. 43 – 45.

15. Сталин, И. Об учебнике истории ВКП(б): Письмо составителям учебника истории ВКП(б)/ И. Сталин// Сталин, И.В. Сочинения: в 18 т./ И.В. Сталин. – М.: Изд-во «Писатель», 1997. – 360 с. – С. 209 – 212.

16. Сцяпанаў, В.І. Рэвалюцыя сацыяльная/ В.І. Сцяпанаў, Ю.А. Гусеў // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: У 12 т. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1973. – Т. 9: Рабкор – Сочы. – 640 с. з іл. і картамі. – С. 234 – 235.